Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА АДЗІНАЙ ГІДРА-МЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ ГАЛОЎНАГА КІРАЎНІЦТВА І ГІДРАМЕТІНСТЫТУТА

Адрас рэдакцыі: Менск, Шырокая 28. Галоўнае Кіраўніцтва АГМС БССР. Тэл. 24271 і 23280.

№ 16 (129)	11—20 лістапада	1933 г.

ЗМЕСТ

СІНАПТЫЧНЫ АГЛЯД.

Гэта дэкада падзяляецца на дзве часткі. У першую палову з 11 па 16 лістапада наглядаецца пахмурнае, цёплае надвор'е з абложнымі ападкамі і вялікімі туманамі, а ў другую палову з 17 па 20 лістапада ўстанаўліваецца сухое, яснае надвор'е з нізкімі тэмпературамі.

У першы дзень дэкады тэрыторыя БССР занята вобласцю высокага ціску з масамі кантынентальна-палярнага паветра, што выклікае паніжэнне тэмпературы да —3°.

12, 13 і 14 лістапада БССР займаецца масамі больш цёплага марскога палярнага паветра, якое прыйшло з паўднёвага захаду і выклікала значнае павышэнне тэмпературы на поўдні да 5° і на поўначы да 3°, а таксама выпадзенне ападкаў.

13 і 14 лістапада на фронце, які падзяляе масы марскога палярнага паветра ад мас арктычнага паветра, на тэрыторыі БССР утвараецца хваля, якая рухаецца на ўсход і выклікае ў гэтыя дні выпадзенне аблажных ападкаў і ўтварэнне моцных туманаў адвектыўнага характара.

Табліца вынікаў метэаралагічных

№№ на карце	Назва станцый	Тэмпература паветра															
		11	12	13	14	15	16	17	18	19	20		Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Чысло, калі наглядалі мінімум
2	Дрыса . . .	0	2	1	0	—2	—2	—4	—10	—12	—13	—	—4	—	—	—21	20
3	Полацак . .	0	2	2	0	—1	0	—4	—7	—11	—12	—	—3	—1	2	—15	20
68	Гарадок . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
84	Сураж . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
7	Нова-Каралёва . . .	—1	1	0	—1	—2	—1	—4	—8	—13	—10	—	—4	—1	2	—17	18
8	Лепель . .	0	2	1	1	0	0	—3	—6	—8	—7	—	—2	—	2	—10	20
75	Плешчаніцы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
70	Бобр . . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
13	Барысаў . .	0	1	2	1	2	1	0	—4	—6	—6	—	—1	0	4	—9	20
16	Менск . .	0	1	2	1	2	1	2	—4	—8	—7	—	—1	0	4	—9	20
93	Бярэзіна . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
23	Марʼіна-Горка	0	2	3	2	5	1	1	—3	—5	—4	—	—	0	6	—8	20
25	Асіпавічы .	1	2	3	3	6	2	2	—1	—4	—4	—	—	0	—	—8	20
10	Орша . .	0	2	1	1	1	1	—1	—5	—8	—7	—	—2	—1	2	—11	20
19	Горкі . .	—1	1	2	2	1	1	—1	—6	—8	—7	—	—2	—1	2	—10	20
89	Клічаў . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
28	Слуцак . .	1	2	—	3	4	1	1	—2	—4	—4	—	—	—	6	—6	20
30	Мар.-Сосны .	1	2	0	6	7	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
21	Магілеў . .	—1	2	3	2	3	2	0	—4	—6	—5	—	0	—1	5	—9	20
73	Чавусы . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
27	Чэрыкаў . .	—1	1	1	3	4	3	1	—4	—6	—5	—	0	—1	5	—8	20
171	Касцюковічы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
31	Турск . . .	0	2	4	3	6	3	1	—3	—5	—4	—	1	0	7	—7	20
32	Жлобін . .	0	3	4	4	7	3	1	—3	—4	—4	—	1	0	8	—7	20
33	Жыткавічы .	2	4	4	4	5	2	2	—2	—4	—4	—	1	1	8	—8	20
37	Калінкавічы .	1	4	4	5	8	3	1	2	—4	—4	—	2	0	10	—9	20
39	Лельчыцы .	2	4	4	6	7	3	3	—1	—4	—4	—	4	—	9	—7	20
85	Чачэрск . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
83	Барба . . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
38	Гомель . .	0	4	5	4	8	4	2	—2	—4	—4	—	2	0	10	—7	20
35	Васілевічы .	1	4	4	5	8	3	1	—2	—1	—4	—	2	0	10	—7	19
40	Людвінава .	1	5	5	5	9	4	4	—1	—3	—3	—	3	1	11	— 7	20

назіранняў за 11—20 лістапада 1933 г.

Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %%	Тэмпература паверхні глебы: Максім.	Мінімальн.	Чысло, калі нагляд. мінімум	Ападкі ў мм.: 11	12	13	14	15	16	17	18	19	20		Сума	Метэаралагічная з'яв (у дужках азначаны чысла)
92	—	—	—	5.0	1.0	0.1	6.0	16.0	2.0	..	..	0.2	..	—	30.3	туман (12—14), галалёд (15, 11)
91	—	—	—	5.0	1.0	1.0	14.0	14.0	3.0	..	..	0.4	..	—	38.4	галалёд (11, 15) тум. (12-
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	3.0	2.0	..	16.0	9.0	1.0	..	..	..	..	—	31.0	—
86	2	—19	19	..	3.0	..	16.0	3.0	..	..	..	..	..	—	22.0	мяцель (11), галалёд (
83	—	—	—	5.0	3.0	3.0	4.0	15.0	1.0	0.1	..	0.1	0.₁	—	31.3	туман (12), галалёд (1
—	—	—	—	6.0	4.0	1.0	14.0	12.0	0.1	0.1	..	0.2	0.	—	37.6	туман (12—17)
—	—	—	—	1.0	6.0	1.0	15 0	16.0	0.1	0.1	..	0.1	0.2	—	39 4	туман (12, 14)
95	—	—	—	5.0	3.0	1.0	19.0	18.0	..	0.1	..	..	..1	—	46.1	тум. (11-15), галалёд (
88	4	—11	20	5.0	3.0	0.4	14.0	14.0	..	..	..	..	..	—	36.4	туман (11—15)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
89	—	—7	20	4.0	2.0	2.0	12.0	17.0	..	..	..	..	..	—	37.0	туман (11, 14)
—	—	—	—	1.0	2.0	1.0	10.0	14.0	..	..	..	..	..	—	28.0	—
90	—	—11	20	2.0	4.0	1.0	12.0	15.0	0.5	..	..	0.1	..	—	34.6	туман (13, 14, 16)
95	4	—9	20	1.0	3.0	0.5	11.0	7.0	..	0.2	..	..	..	—	22.7	туман (12-16), галалёд (
—	—	—7	—	3.0	1.0	0.1	8 0	12.0	0.1	0.1	..	0.1	0.1	—	24 5	туман (11)
87	3	—	20	3.0	2.0	0.3	6.0	14.0	..	..	0.1	..	..	—	25.4	туман (11—15)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
91	—	—	—	4.0	3.0	..	8.0	8.0	..	..	..	..	..	—	23.0	туман (11—16)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
87	—	—	—	3.0	1.0	3.0	13 0	14.0	0.2	..	..	..	..	—	34.2	туман (12—16)
—	—	—	—	3.0	1.0	1.0	7.0	3.0	0.1	0.1	0.1	0.1	0.2	—	15.6	туман (11—17)
83	7	—11	20	1.0	0.6	2.0	7.0	7.0	..	..	..	..	..	—	17.6	туман (12, 13, 15)
87	—	—	—	1.0	1.0	2.0	3.0	8.0	0.2	..	..	..	..	—	15.2	туман (11—15)
83	—	—11	20	1.0	2.0	0.3	4.0	6.0	..	..	..	..	..	—	13.3	туман (11, 12, 14, 15, 1
84	—	—	—	1.0	1.0	..	1.0	3.0	..	..	..	..	..	—	6.0	—
82	—	—	—	5 0	1.0	2.0	0.2	4.0	0.2	..	..	..	..	—	12.4	туман (15)
—	—	—	—	5.0	1.0	1.0	3.0	3.0	0.1	..	..	..	..	—	13.1	туман (12—15)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
83	3	—9	20	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	туман (12, 14, 15)
82	—	—	—	0.1	1.0	1.0	1.0	6.0	..	..	..	..	..	—	9.1	туман (20), мяцель (12
76	9	—6	20	5.0	3.0	0.2	0.5	3.0	0.1	0.1	0.1	0.2	0.1	—	12.3	туман (11, 12)

Табліца вынікаў метэаралаг.назіранняў за 11—20 лістапада 1933 г

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы: Напрамак	Вецер: Пераважаючы: Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю: Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю: Хуткасць	Інсаляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме: Ніжняя	Сярэдні стан паверхнёвага пласта глебы (на глыб. 10—15 см.)
I. Паўночны (Вазёрны)	2	Дрыса	SE	4	SE	9	—	9	8	замерзшая
	3	Полацак	E	2	E	6	—	9	8	—
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	сухая
	7	Нова-Каралёва	E	4	NE	9	9	7	5	замерзшая
II. Пераходны (Вадападзельны)	8	Лепель	E	4	E	6	—	8	8	замерзшая
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	замерзшая
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	"
	13	Барысаў	SW	2	SW	6	—	9	8	"
	16	Менск	E	2	SW	6	—	8	8	"
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	NE	4	W	6	14	8	5	замерзшая
	25	Асіпавічы	SW	2	SW	6	—	8	8	"
	10	Орша	E	2	E	4	—	9	8	"
	19	Горкі	NE	4	NE	12	—	8	7	"
III. Цэнтральны (Раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	замерзшая
	28	Слуцак	W	4	E	6	—	8	8	—
	30	Мар'іна-Сосны	—	—	—	—	—	—	—	—
	21	Магілеў	E	2	SW	6	—	9	8	замерзшая
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	SW	4	W	9	—	—	7	замерзшая
	171	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	"
	31	Турск	W	2	W	4	—	8	8	"
	32	Жлобін	E	4	W	9	—	8	8	"
IV. Паўднёвы (Нізінны)	33	Жыткавічы	E	2	W	9	—	7	7	замерзшая
	37	Калінкавічы	E	4	W	9	—	8	5	—
	39	Лельчыцы	E	4	SW	6	—	10	9	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	замерзшая
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	SE	3	E	4	—	8	8	замерзшая
	35	Васілевічы	SW	4	SW	9	19	8	8	"
	40	Людвінава	E	6	SW	—	—	9	9	—

15 і 16 лістапада гэтае паветра працягвае ўтрымпіваецца на месцы і ператвараецца ў кантынентальна-палярнае ў выніку доўгага знаходжання на кантыненце.

16 ліку поўнач рэспублікі пачынае паступова займацца арктычным паветрам і ў раёнах Віцебшчыны і Полаччыны ўжо наглядаецца значнае паніжэнне тэмпературы да —2^{0}, між тым як на поўдні краіны, у раёнах Жыткавічы—Васілевічы тэмпература дасягае да 10^{0}.

У звязку з гэтым, мы наглядаем спыненне ападкаў, памяншэнне воблачнасці і вільготнасці паветра.

18, 19 і 20 лістапада БССР цалкам занята вобласцю высокага ціску, якая складаецца з мас арктычнага паветра. Тэмпература ў гэтыя дні значна паніжаецца і дасягае ў раёне Полаччыны —18^{0}, а на поўдні ў Жыткавіч —8^{0}, і ўстанаўліваецца ціхае і яснае надвор'е.

Л. Харлап.

МЕТЭАРАЛАГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

за 11—20 лістапада 1933 г.

З боку тэмпературнага рэжыма гэтай дэкады ўсю БССР магчыма падзяліць на 2 часткі: у паўночнай і пераходнай зонах сярэдняя т-ра на 1-2^{0} ніжэй нармальнай, а ў цэнтральнай і паўднёвай на 1-2^{0} вышэй. На працягу дэкады т-ра хісталася наступным чынам: у 1-ы дзень яна блізка да 0^{0}, потым павышаецца. На поўнач ад лініі Менск—Горкі гэта павышэнне дасягае ўсяго 2^{0} і ўжо 14-15-га т-ра зноў зніжаецца і ў канцы дэкады знаходзіцца ў межах —6—13^{0}. У паўднёвай частцы БССР павышэнне працягваецца да 15-га, т-ра дасягае 5—8^{0}, потым зніжаецца і ў канцы дэкады хістаецца ад —4 да —6^{0}. Максімальная за дэкаду т-ра хістаецца ад 2 да 11^{0}, мінімальная ад —7 да —21^{0}. Надзвычайна нізкая т-ра —21^{0} наглядалася ў Дрысе 20-га.

Па колькасці выпаўшых ападкаў БССР можна падзяліць на такія часткі: паўночную да лініі Слуцак—Касцюковічы, дзе выпала 25—35 мм, і паўднёвую, дзе выпала каля 15 мм. Ападкі выпадалі выключна ў 1-ую палову дэкады, пачынаючы з 16-га чысла наглядалася вельмі сухое надвор'е. Вялікія сутачныя колькасці ападкаў наглядаліся 14 і 15-га, яны даходзілі амаль да 20 мм.

На працягу ўсёй 1-ай паловы дэкады наглядаліся інтэнсіўныя туманы.

Вятры наглядаліся самых рознастайных напрамкаў, але ў большасці пераважалі ўсходнія. Хуткасці іх невялікія.

Воблачнасць хісталася ад 80 да 100 проц. агульнага пакрыцця неба, сонечнае ззянне наглядалася зусім кароткі час.

Глеба па ўсёй БССР замерзла к канцу дэкады. Мясцамі на поўначы з'явіўся снегавы насціл.

Н. Малішэўская.

Сельска-гаспадарчая гідраметэаралагічная характарыстыка за дэкаду.

Ход метэаралагічных элементаў у адзначаную дэкаду не з'яўляўся дрэнным для стану азімых. Глеба мае дастатковую колькасць вільгаці, на глыбіню 5—10 см мерзлая.

Азімыя знаходзяцца ў фазе пераважна поўнага кушчэння. Падрыхтоўка іх да ўходу пад снег здавальняючая, улічваючы паступовае зніжэнне тэмпературы без рэзкіх хістанняў. Выпас жывёлы на папасах скончыўся, толькі Васілевічы (Рэчыцкі р-н) адзначаюць працяг папасаў.

С. Старобіна.

ВЫВАДЫ

Камісіі ў складзе т. т. Бугаева, Дудкіна, Кучынскага, выдзеленай згодна загада па Галоўнаму Кіраўніцтву АГМС БССР ад 26/X г. г. па праверцы работы Бюрр Надвор'я БССР у сувязі з заметкай „Заставить метеорологию служить социалистическому земледелию", якая была даслана Кантрольна-Інспектарскім Сектарам НКЗБ.

1. Дэталёва разгледзіўшы выпадак дрэннага прагноза на 9/X, які быў складзен фізікам т. Харлапам, камісія канстатуе наступнае:

а) па ранішняй карце 8-X, па якой складаўся асноўны прагноз, прадугледзіць выпадзенне дажджа 9-X было немагчыма;

б) па дзённай карце мелася невялікая магчымасць выпадзення невялікага дажджа к вечару 9 кастрычніка;

в) па вячэрняй карце (8-X) мелася поўная магчымасць устанавіць выпадзенне дажджа на наступны дзень, што не было зроблена, у выніку таго, што ў Бюро Надвор'я апрацоўка гэтай карты заканчваецца па тэхнічным прычынам[1] у 2 гадз. ночы, прычым прагноз па ёй не складаўся.

г) Камісія адзначае нізкую якасць даваемых т. Харлапам прагнозаў, што ў асноўным тлумачыцца няўважлівым і неглыбокім аналізам карт надвор'я як папярэдніх, так і бягучых, па якім складаецца прагноз. К таму т. Харлап, як правіла, не праслухоўвае кансультацый па радыё, якія перадаюцца Цэнтральным Бюро Надвор'я (у Маскве).

У сувязі з гэтым камісія лічыць неабходным папярэдзіць т. Харлапа звярнуць сугубую ўвагу на знішчэнне паказаных вышэй недахопаў, а ў выпадку іх паўтарэння да яго будуць прыняты адпаведныя меры ўздзейнічання.

2. Камісія асобна адзначае, што Дырэктар Бюро Надвор'я тав. Варушыла не зрабіў належных вывадаў ні з пастановы ЦК КП(б)Б аб апалітычнасці доўгатэрміновага прагноза, складзенага к вясенняй сяўбе, а таксама з тых недахопаў работы Бюро Надвор'я, якія адзначыла камісія ў вывадах па чыстцы ячэйкі КП(б)Б Гідраметінстытута.

[1] Радыёпрыём метдадзеных канчаецца а 1 гадз. уночы.

Апошнія два артыкулы аб дрэннай якасці прагнозаў, якія дасланы рэдакц. газеты „Рабочий“ для прыняцця адпаведных захадаў, таксама не атрымалі дастатковага адбітка на рабоце Бюро Надвор'я. Усё гэта гаворыць аб тым, што т. Варушыла не змог своечасова мабілізаваць работнікаў на ліквідацыю прарываў і да гэтага часу не забяспечыў чоткага, канкрэтнага кіраўніцтва работай Бюро Надвор'я.

3. Для палепшання якасці работы Бюро Надвор'я камісія лічыць неабходным Дырэктару Бюро Надвор'я т. Варашыла правесці наступныя мерапрыемствы:

а) Забяспечыць складанне прагнозаў па ўсім сінаптычным картам з складаннем пісьмовых аналізаў іх і занясеннем у адпаведную кнігу.

б) Абавязаць усіх фізікаў Бюро ў часе свайго дзяжурства праслухоўваць кансультацыі як удзень, так і ўначы, якія перадаюцца Цэнтральным Бюро Надвор'я і „ГАМС'ам“, запісваючы вынікі параўнання з сваімі аналізамі ў асобную кнігу.

в) Абавязаць асістэнтаў Б. Н. у часе свайго дзяжурства прымаць і заносіць на карту, для яе дапаўнення, лічбовыя метэазводкі, якія перадаюцца па шырокавяшчанню Ц. Б. Н.

г) Абавязаць заг. радыёстанцыяй т. Турцэвіча перагледзіць парадак радыёпрыёма метэададзеных, якія прымаюцца з Зах. Эўропы.

д) Для знішчэння абязлічкі ў перадаваемых праз Менскую Радыёстанцыю прагнозах паказваць прозвішча фізіка, які складаў прагноз, а таксама прозвішча асобы, якая вяла перадачу.

е) К 1/XII выпрацаваць тыповую схему кансультацыі, якая перадаецца па радыё.

ж) Адзначаючы, што з боку т. Варушыла не выканана прапанова нарады пры Вайсковым Сектары аб індывідуальнай ацэнцы апраўдваемасці прагнозаў кожнага фізіка з складаннем па сканчэнні месяца рэзультатыўных зводак, у сувязі з чым лічым неабходным у апошні раз папярэдзіць, каб гэта ацэнка была ўведзена не пазней 1/XII г. г.

з) К 1/XII прапрацаваць парадак перавода фізікаў на здзельшчыну, вытвараючы аплату кожнага з іх у залежнасці ад прац. удачнасці прагнозаў.

Старшыня Камісіі Бугаеў

Члены Каміісі: Дудкін, Кучынскі

ЗАГАД № 137

па Галоўнаму Кіраўніцтву Адзінай Гідраметслужбы БССР ад 17/XI-33 г.

§ 1

Вывады Камісіі па абследванню работы Бюро Надвор'я ў звязку з заметкай „Заставіць метэаралогію служыць соц. земляробству“ зацвердзіць, змясціўшы іх у чарговым нумары бюлетэня.

§ 2

Т. Харлапу, сіноптыку Бюро Надвор'я, за нядобрасумленныя адносіны да складання прагнозаў, нядбайныя і неглыбокія аналізы карт надвор'я як папярэдніх, так і бягучых, па якім даецца прагноз, нескарыстанне кансультацый па радыё, перадаваемых Цэнтральным Бюро Надвор'я (з Масквы), што адмоўна адбіваецца на якасці даваемых ім прагнозаў, в ы н о ш у в ы м о в у, папярэдзіўшы тав. Харлапа, што калі ён не зверне сугубай увагі на зжыццё адзначаных камісіяй за ім недахопаў і ў выпадку паўтарэння такавых, да яго будуць ужыты больш суровыя меры спагнання.

§ 3

Дырэктару Бюро Надвор'я т. Варушыла перабудаваць працу згодна вывадаў камісіі па чыстцы і камісіі па абследванню працы Бюро Надвор'я, звярнуўшы ў асаблівасці ўвагу на падвышэнне якасці даваемых прагнозаў і абслугоўванне соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, забяспечыўшы цалкам выкананне адзначаных прапаноў.

На працягу дэкаднага тэрміна праверыць соцыяльны склад працуючых работнікаў у Бюро Надвор'я, з тым каб ушчыльніць і ачысціць апарат Бюро Надвор'я ад соцыяльна-варожых элементаў.

Папярэдзіць тав. Варушыло, што калі не будзе ім зроблена пералома ў падвышэнні якасці працы Бюро Надвор'я, будзе пастаўлена пытанне аб далейшым кіраўніцтве.

Нач. Гал. Кір. АГМС БССР Мамаеў.

Друкарня БелАН. Гарліт № 2499. Заказ № 4644. Тыраж 1000 экз. 1/2 арк.